Падтрымай "Вясну" на PATREON

За пратэсныя графіці жыхар Слоніма атрымаў "хатнюю хімію"

20.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



У Слоніме 19 ліпеня абвешчаны чарговы прысуд па крымінальнай справе палітычнага характару, піша "Гарадзенская Вясна". На гэты раз у дачыненні да мясцовага жыхара Віталя Маркевіча.

Яго звінавацілі паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу за тое, што Маркевіч намаляваў графіці "асабліва цынічнага складу". Гэта **частка 1 артыкула 339** (Хуліганства) і **341** (Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці ў грамадскіх месцах) Крымінальнага кодэксу.

Маркевіч у мінулым годзе пасля фальсіфікацыі выбараў і збівання людзей на мірных акцыях зрабіў некалькі графіці на розных аб'ектах Слоніма і Слонімскага раёну (у вёсцы Шылавічы), у тым ліку на прыпынках. Адзін з надпісаў на закінутай сцяне датычыўся начальніка мясцовага РАУС (сэнс быў такі, што "народ не даруе").


Суддзём на працэсе быў **Аляксандар Ярмолік**, дзяржабвінавачанне прадстаўляў старшы памочнік пракурора **Уладзімір Калеснікаў**.


У Маркевіча чацвёра непаўнагадовых дзяцуй, але суд не ўзяў пад увагу гэтую акалічнасць.

Суддзя прысудзіў яму па сукупнасці **абмежаванне волі на 1 год і 1 месяц без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу** ("хатняя хімія"). Рэчавыя доказы, у тым ліку нацыянальны сцяг, сцяжок і нават значок суддзя пастанавіў знішчыць.


Твитнуть







ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY